**Літаратура**

1. Беларуская літаратура 5–11 класы: вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск: Ма РБ, НІА, 2009. – 128 с.
2. Лявонава, П.І. Беларуская літаратура ў пытаннях і адказах: 10 клас: дапам. для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў / П. І. Лявонава, М. У. Грынько, М. В. Савіцкі. – Мінск: Універсалпрэс, 2007. – 384 с.
3. Лявонава, П.І. Аналіз мастацкага тэксту як педагагічная праблема / П.І. Лявонава // Литература в контексте культуры: типология, взаимосвязи, проблемы преподавания: сб. науч. ст. / под общ. ред. Г.В. Синило, Э.А. Усовской. – Минск: БГУ, 2009. – С. 93–103.


***А.В. Макарава (Мінск, БДПУ)***

## «РАДАСЦЬ СУСТРЭЧЫ»: МАТЫЎ СПАТКАННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ ЁГАНА ВОЛЬФГАНГА ГЁТЭ, РОБЕРТА БЁРНСА І МАКСІМА ТАНКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Інтымная лірыка з'яўляецца неад'емнай часткай сусветнай літаратуры. Да яе звярталася шмат славутых пісьменнікаў, сярод якіх У. Шэкспір, Ф. Петрарка, Г. Гейнэ, А. Пушкін, М. Багдановіч і многія іншыя. У вершах песняроў кахання натуральна прысутнічае матыў спаткання.

Не сталі выключэннем творы Р. Бёрнса, на прыродны талент якога паўплывалі народныя традыцыі Шатландыі. Так, напрыклад, у вершы ***«Вяртанне салдата»*** мужчына, які прайшоў усе жахі вайны, але застаўся чэсным чалавекам (*«Салдат не ганьбіў грабяжом // Старэнькі свой падсумак»* [1, с. 30]), вяртаецца да каханай. Яна для салдата з'яўляецца найлепшай узнагародай *«за чэсць, і доблесць, і за кроў, пралітую ў паходах»* [1, с. 31]. Спатканне салдата з той, што чакала яго, – сімвал аднаўлення жыцця, якое было зруйнавана, сімвал вылячэння яго душы ад ран, нанесеных вайной.

У вершы ***«Начлег у дарозе»*** лірычны герой трапляе ў экстрэмальную жыццёвую сітуацыю: *«У студзені мяне ў горах // Аднойчы агарнула ноч. // Завея, сівер – проста страх, // А снег па пояс, толькі збоч»* [1, с. 53]. Яго ратуе дзяўчына, якая пусціла героя пераначаваць. *«Ідуць гады не пехатой, // Бягуць, і не спыніць іх бег. // Пакуль жыву, не здраджу той, // Што мне дала тады начлег»* [1, с. 55]. Бёрнс сцвярджае думку аб тым, што ў цяжкі перыяд жыцця, калі чалавек не можа знайці выйсця, яго можа выратаваць і вярнуць да жыцця каханне, якое нараджаецца ў час першага спаткання.

Матыў спаткання выразна гучыць у лірыцы Ё.В. Гётэ. У вершы ***«Спатканне і растань»*** паэт пры дапамозе метафар (*сэрца кліч, сэрца полымем гарэла, журботна свяціла поўня* і інш.) і параўнанняў (*« І конь памчаў, нібы страла»; «Дуб узвышаўся, нібы волат»* [2, с. 27] і г. д.) ярка абмалёўвае імкненне аднаго чалавека да другога. Умоўна верш можна падзяліць на тры часткі. Першая частка насычана дзеясловамі: *«Быў сэрца кліч: хутчэй да коней! / І конь памчаў, нібы страла, // Зямлю ўскалыхвала сутонне, // І ноч да стромых гор паўзла. <...> Я ўзнёслы быў, ляцеў мой конь: // Як сэрца полымем гарэла! // Які па жылах цёк*



Scanned by CamScanner

*агонь!»* [2, с. 27]. Лірычны герой не можа дачакацца запаветнай гадзіны і імчыцца да каханай. У другой частцы адлюстравана само спатканне, асалода ад гэтых імгненняў: *«І ўбачыў я цябе: пяшчота // З вачэй струменіла тваіх: // Была тваёй мая істота, // Быў для цябе мой кожны ўздых»* [2, с. 27]. І трэцяя частка – ростань, якая прычыняе столькі болю закаханым. Але паэт ставіць аптымістычную кропку: *«І ўсё ж, як слаўна быць каханым! // Багі! як слаўна ўсё ж – кахаць!»* [2, с. 28].

Больш інтымным па сваім змесце з'яўляецца верш ***«Крыштэль»***. Калі ў папярэднім творы герой амаль крычаў аб сваім каханні (наяўнасць у вершы вялікай колькасці клічных сказаў), то тут інтанацыя спакойная, нават спавядальная. Значная частка верша адведзена апісанню знешнасці дзяўчыны: *«Хітрынка воч, паўколлі броў – // Два чорных спарышы, –* <...> *Ды вусны – брыянат мілей, // Круглей – шчок мілых гладзь, // А нешта ёсць яшчэ круглей, – // Вачэй не адарваць!»* [2, с. 28]. Калі ў першым творы лірычны герой не мог утаймаваць свае пачуцці, то для героя гэтага верша важны сам момант чакання сустрэчы з каханай: *«Магу я больш, чым мог магчы: // Дзень цэлы прачакаць, // А ўночы пры яе плячы // Ад страху – не ўміраць»* [2, с. 29].

У сваіх вершах Ё.В. Гётэ не паказвае далейшага развіцця падзей у жыцці закаханых людзей. Для яго важны менавіта момант спаткання, які перарастае ў пачуццё духоўнага і плоцкага кшталту.

Інтымная лірыка Максіма Танка набывае філасофскае гучанне. Гэта яскрава праявілася ў вершы ***«Радасць сустрэчы»***: *«Усё ж нам пашанцавала, // Што зямля аказалася круглай. // Бо інакш, разышоўшыся некалі // У процілеглых напрамках, // Ці змаглі б мы ізноўку сустрэцца з табой?»* [3, с. 292]. Спатканне для лірычнага героя з той адзінай жанчынай, разам з якой хочацца прайсці ўвесь жыццёвы шлях, – гэта шанс у жыцці, які стаў шчаслівай выпадковасцю. Хісткасць, няўстойлівасць, зменлівасць жыцця адлюстравана нават у пытальнай форме верша.

Лірычны герой верша ***«Вядома, што толькі...»*** зрабіў памылку маладосці і разышоўся з каханай. І цяпер, праз шмат гадоў, ён шукае сустрэчы з ёй. У твор уводзіцца вобраз цыганкі: *«На фэсце цыганка // На мінікамп'ютары // Мне вываражыла // Сустрэчу з табой»* [3, с. 91]. Яна – сімвал непрадказальнасці жыцця. Але герой спадзяецца на лепшае, на новы шанс у сваім лёсе: *«Іду і з надзеяй // На кожнай вуліцы // Цябе выглядаю // Ў натоўпе людскім»* [3, с. 91].

Каханне для Максіма Танка, як і спатканне, – патаемная частка жыцця, якую нельга выносіць на паказ (верш ***«Каханне ад людзей не ўтоіш»***): *«Каханне ад людзей не ўтоіш. // І ўсё ж доўга ніхто // Не здагадваўся аб нашых стрэчах, // Бо ты так умела на іх // Непрыкметна прыбегчы, // Што і весні цы не паспявалі // Са здзіўлення прарыпець, // І пыл на вуліцы ўзняцца, // І трава шалахнуцца, // І з калосся апасці раса, // Як пасля сонная подыху ветру, // Ці пралёту ластаўкі, // Ці прамільгнулай // Зоркі»* [3, с. 127].

Нягледзячы на адносную прастату структуры твораў Максіма Танка, яго вершы не страчваюць укладзенай у іх глыбокай думкі пра тое, што сустрэча і спатканне – дзве важныя складовыя часткі жыцця, якімі кожны чалавек павінен ганарыцца.

Такім чынам, матыў спаткання ў творчасці розных пісьменнікаў (Р. Бёрнса, Ё.В. Гётэ і М. Танка) набывае адрозныя адзін ад аднаго гучанні. Гэта абумоўлена і эпохай, і сацыяльным слоем грамадства, з якой выйшаў пісьменнік, і самім светапоглядам аўтара. Р. Бёрнс у сваіх творах разглядаў спатканне з каханай як сімвал аднаўлення душы чалавека пасля наступстваў вайны ці цяжкіх жыццёвых калізій. Для Ё.В. Гётэ важным момантам з'яўляецца



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Scanned by CamScanner

такая сустрэча, за якой адбываецца духоўнае і фізічнае яднанне двух людзей. А М. Танк з філасофскіх пазіцый асэнсаваў спатканне як падарунак лёсу, шчаслівы выпадак, які асвячае, адухаўляе ўсё наступнае жыццё.

***Літаратура***


1. Бёрнс, Р. Вам слова, Джон Ячмень!: выбраная лірыка / уклад., пер. з англ. і прадм. Я. Семяжона. – Мінск: Маст. літ., 1983. – 125 с.
2. Гётэ, Ё.-В. Выбраныя творы / уклад., прадм. Л. Баршчэўскага і П. Копанева, камент. Л. Баршчэўскага і В. Сёмухі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. – 640 с.
3. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / Максім Танк; рэд. В.П. Жураўлёў; падрыхт. тэкстаў і камент. Т.У. Мархель. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Т. 6: Вершы (1983–1995). – 454 с.



***Т.Л. Макаранка (Мінск, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа)***


## МАКСІМ ТАНК – ЯКУБУ КОЛАСУ. АЎТОГРАФЫ, ДАРЧЫЯ НАДПІСЫ, ПРЫСВЯЧЭННІ

У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа зберагаюцца кнігі Максіма Танка з неапублікаванымі раней дарчымі надпісамі песняру. Гэта выданні: М. Танк. Янук Сяліба. Масква: Совецкая Беларусь, 1943., М. Танк. Пад вогненны небасхіл. Мінск, 1945, М. Танк. Каб ведалі. Мінск. 1948., М. Танк. Выбраныя творы. Мінск, 1952., М. Танк. У дарозе. Мінск, 1954. Максім Танк высока цаніў талент Канстанціна Міхайлавіча, з павагай ставіўся да яго. Ён прысвяціў Коласу наступныя вершы: «Тры песні» (1936 г.), «…Ізноў перад табой…» (1937 г.), «Якубу Коласу» (1948 г.), «Мой родны кут» (1955 г.), «Якуб Колас збірае грыбы» (1969 г.).

Такія звароты ў дарчых надпісах да Канстанціна Міхайлавіча, як «Настаўнік», «Бацька», «Пясняр», Танк заўсёды пісаў з вялікай літары.

*М. Танк. Выбраныя творы. Мінск, 1952.*

Дарагому і любімаму Настаўніку
Канстанціну Міхайлавічу Коласу
… Сягоння сонцам дальшляхоў азорана,
Але я заўжды помню голас Твой,
Што над далёкімі вілейскімі азёрамі
Прышоў за хлопцам-пастухом, за мной.

Максім Танк
Мінск. 6.VII.1952 г.

*М. Танк. Каб ведалі. Мінск, 1948.*

Дарагому Канстанціну
Міхайлавічу Коласу
Вялікаму Песняру нашай
роднай зямлі і любімаму
Настаўніку. З павагай –

Максім Танк
Мінск. 17-XI-1948 г.

*М. Танк. Янук Сяліба. Масква. Совецкая Беларусь, 1943.*

Майму хроснаму Бацьку,
Паважанаму і дарагому
Канстанціну Міхайлавічу
Коласу.
З павагай –

Максім Танк
Масква. 9.XII-1943 г.

*М. Танк. У дарозе. Мінск, 1954.*

Дарагому Канстанціну
Міхайлавічу Коласу
нашаму Бацьку і Настаўніку.
Песняру, якому даверыў
па праву народ няўміручыя
думы і славу.
З пашанай –

Максім Танк
7/XII.1954 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Scanned by CamScanner